УДК 338 (476)

А. У. Яфімаў, выкладчык Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта

# СУТНАСЦЬ ЭКАНАМІЧНАГА МЕХАНІЗМУ РЭСТРУКТУРЫЗАЦЫІ ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ

The aim of the article is present some considerations about the essence of economic mechanism in domain of enterprise restructuring. The meaning of category «mechanism» is viewed through its origination in philosophy, technics and natural sciences. Several opinions of researchers from CIS indicate a little level of study of this category in economic sphere. There are also presentations of close definitions, such as specific mechanism in national economy and organisation. Finally, some thoughts about the composition and elements of economic mechanism of microrestructuring are presented.

**Уводзіны**. Ва ўмовах рынкавай эканомікі кожны суб'ект гаспадарання знаходзіцца ў зменлівым асяроддзі. Працэсы зменаў у вонкавым асяроддзі з'яўляюцца аднымі з фактараў, якія абумоўліваюць неабходнасць структурных зменаў на прадпрыемстве. Адным з ключавых паняццяў, што характарызуюць структурныя змены, выступае катэгорыя эканамічнага механізму рэструктурызацыі прадпрыемстваў. Трэба адзначыць, што, на нашу думку, дадзенае паняцце належыць да катэгорыі адносна новых у наяўным спектры навуковых тэрмінаў, што датычаць тэорыі пераўтварэнняў на мікраўзроўні.

Сутнасць, характар, асаблівасці зместу дадзенай катэгорыі апісаныя даследчыкамі толькі ў пачатковых рысах, г. зн. даволі павярхоўна. Гэта сувязана, па-першае, з тым, што да цяперашняга часу яшчэ не паўстала дастатковая, крытычная колькасць аналітычных працаў, якія закранаюць дадзенае пытанне, што прывяло б да істотных якасных зменаў у яго разуменні. Па-другое, па сённяшні дзень усё яшчэ назіраюцца істотныя адрозненні ў разуменні значнай колькасці змястоўных паняццяў, датычных тэорыі структурных зменаў, паміж даследчыкамі з развітых краінаў і дзяржаў з пераходнымі эканамічнымі сістэмамі (а сярод апошніх – паміж навукоўцамі з СНД і Усходняй Еўропы).

Паспрабуем прааналізаваць некаторыя існыя падыходы ў дадзеным пытанні і сфармуляваць пэўныя высновы.

**Сутнасць эканамічнага механізму рэструктурызацыі прадпрыемстваў.** Разгляд сутнасці эканамічнага механізму варта пачаць з фармулявання сутнасці паняцця *«механізм»*. Паводле грэчаскага арыгінала, яно вызначаецца як прылада ці машына. Найбольш устойлівыя асацыяцыі дадзенае паняцце выклікае з пэўнымі тэхнічнымі сродкамі, а потым – з комплексам натуральных навук. Для сацы-яльных навук, да якіх належыць эканоміка, яно з'яўляецца адносна новай, менш засвоенай, угрунтаванай, укаранёнай дэфініцыяй, чым у асяродку механікі і тэхнікі. Пэўна, што варыятыўны змест дадзенага слова прайшоў трансфармацыю ад тэхнікі → да натуральных навук → да вывучэння грамадскіх з'яваў. Менавіта ў тэхнічным сэнсе механізм выступае як унутраная сістэма пэўнай прылады, якая яе ўрухомлівае. А ўжо пасля, па ступені таго, як даследаванні ў галіне вывучэння грамадства пачалі пранікаць усё глыбей у сутнасць канкрэтных з'яваў, паняцце механізму набыло выгляд сістэмы, якая вызначае ход пэўнага працэсу.

Расійскі навуковец Я. Каралёў спрабуе грунтоўна падысці да высвятлення сутнасці эканамічнага механізму ў сваім доктарскім даследаванні. Ён справядліва сцвярджае, што нягледзячы на даволі шырокае ўжыванне дадзенага паняцця ў эканамічным аналізе, яго дакладнае азначэнне ў большасці выпадкаў адсутнічае (альбо не падыходзіць да задачаў ягонага даследавання). Далей ён атаясамляе змест дадзенага паняцця ў філасофскай, эканамічнай, фізічнай і тэхнічнай літаратурах, звёўшы яго да ўсіх выпадкаў як даволі канкрэтную сістэму сувязяў паміж прычынай і вынікам, які забяспечвае стварэнне прычыны дадзенага выніку. Абапіраючыся на гегельянскае тлумачэнне сувязі прычыны і дзеяння, ён разглядае механізм праз паняцце сістэмы перадачы дзеяння і ў рэшце рэшт прыводзіць сваё тлумачэнне дадзенай катэгорыі – «даволі дакладная сістэма сувязяў і адносінаў, якая забяспечвае пераўтварэнне і перадачу дзеяння ад прычын, рухавых сіл да спароджаных імі наступстваў (у дадзеным выпадку – працэсаў і з'яў)» [8].

Адбіткам пэўнага ўзроўню дасягнутых ведаў выступаюць адмысловыя зводы паняццяў (слоўнікі, энцыклапедыі). Калі разгледзець пэўны іх абсяг, выдадзены ў суседніх краінах за апошняе дзесяцігоддзе, можна ўбачыць практычна поўную адсутнасць тлумачэння паняцця *«эканамічны механізм»*. Затое назіраецца прысутнасць паняцця *«гаспадарчы механізм»*.

У расійскай эканамічнай энцыклапедыі, выдадзенай у 1999 годзе, паняцце гаспадарчага механізму тлумачыцца з пазіцый пераходнага этапу і мае супольны планава-рынкавы змест. У яго структуры прысутнічаюць як інстытуты, групавыя і прыватныя інтарэсы, так і формы і метады гаспадарання. Уверсе знаходзіцца дзяржава як частка нацыянальнай эканомікі. Далей даследчыкі аднабакова сцвярджаюць аб неўжыванні дадзенага тэрміну ў адмысловай сучаснай літаратуры, але ў той жа час яго падсвядомым

разуменні як шляху адаптацыі існых гаспадарчых сістэм да новых умоваў. У прыватнасці, гаворка ідзе пра пабудову ў развітых краінах новага, постіндустрыяльнага ладу [14].

Украінскі даследчык С. Мачэрны падыходзіць да разумення гаспадарчага механізму пераважна з пазіцый марксісцкай тэорыі. У яго тлумачэнні прысутнічаюць і ўласнасць, і спосаб вытворчасці, і класавыя інтарэсы. Далей ён даволі грунтоўна разглядае асаблівасці разумення зместу дадзенай катэгорыі ў навуковай літаратуры. Адной з такіх рысаў, на яго думку, выступае атаясамленне паняццяў гаспадарчага і эканамічнага механізму. Прычыны такой непаслядоўнасці бачацца ім пераважна ў слабасці тэарэтычнага фундаменту. На думку даследчыка, сучасны гаспадарчы механізм сфармаваны ў працэсе аптымальнага ўз'яднання дзяржаўнага рэгулявання і рынкавых захадаў, а ядром такой структуры выступае дзяржаўны ўплыў на эканоміку. Як і ў папярэдняй крыніцы, цяперашні тып такога механізму арганічна сувязаны з паўстаннем рынкавай эканомікі, г. зв. змяшанага тыпу [9].

Расійскія даследчыкі, Г. і Р. Вечканавы даюць тры тлумачэнні паняцця гаспадарчага механізму. У першым прысутнічае базіс і надбудова, другое выступае спосабам гаспадарання. Трэцяе прадстаўлена як супольнасць формаў, метадаў і інструментаў кіравання эканомікай. Як і папярэднімі аўтарамі, падкрэсліваецца гістарычнасць дадзенага паняцця, яго спецыфічнасць для кожнага этапу эвалюцыі грамадства [3].

Нарэшце, у новым выданні аднаго з расійскіх эканамічных слоўнікаў прысутнічае тое паняцце, якое цікавіць нас найбольш, – тлумачэнне *эканамічнага механізму*. Ён разумеецца як «супольнасць метадаў і сродкаў уздзеяння на эканамічныя працэсы, іх рэгулявання» [11].

Даследчыкі з заходніх краін спрабуюць разглядзець у тым ліку гаспадарчыя змены ў кантэксце сацыяльна-палітычных трансфармацый у свеце за апошнюю чвэрць стагоддзя. Яны даюць паняцце сістэмы, яе структуры, прынцыпаў эвалюцыі, узаемадзеяння паміж элементамі сацыяльнага ўладкавання. Але ў той самы час даволі шырокае разуменне тэорыі структурных змен не дазваляе аўтарам сфармуляваць больш-менш устойлівы эканамічны іх аспект [15].

Яшчэ адной катэгорыяй, датычнай прадмета дадзенага агляду, выступае паняцце *арганізацыйна-эканамічнага механізму.* Трэба адзначыць, што яно даволі шырока прадстаўлена ў найноўшай даследніцкай літаратуры суседніх усходніх краін.

Так, разглядаючы інавацыйныя працэсы, С. Дронаў вызначае арганізацыйна-эканамічны механізм як унутраную форму адпаведнай дзейнасці, якая вызначае ў далейшым увесь іх ход. Далей паказана супольнасць чыннікаў, якія ўплываюць на функцыянаванне дадзенага механізму. Гэта дзейсныя на дадзены момант фактары рознага характару. Яны падзелены на макраэканамічныя (тып і структура нацыянальнай эканомікі, стан функцыянавання розных яе падсістэм, сацыяльныя прыярытэты) і мікраэканамічныя (закранаюць спецыфіку функцыянавання канкрэтнага прадпрыемства). Графічнае ўвасабленне адпаведнага механізму дэманструе складаны характар сувязі паміж пэўнай арыгінальнай ідэяй, інавацыйным працэсам і фактарамі, якія ўплываюць на яго ажыццяўленне [5].

Даследчык А. Букрэеў разглядае асаблівасці антыкрызіснага кіравання прадпрыемствам. Ён адзначае комплексны характар функцыянавання адпаведнага механізму як шматузроўневую сістэму больш дробных ўзаемасувязаных механізмаў рознай прыроды. У фармуляванні паняцця такога механізму, аўтар закранае мікраўзровень – прадстаўляючы гэту катэгорыю як супольнасць арганізацыйных форм і эканамічных метадаў, якія ўкаранёныя на гэткім узроўні. Далей падаецца пакрокавая структура такога механізму: 1) знаходжанне аб'екта і мэты зменаў → 2) трансфармацыя мэты зменаў у іх крытэрый → 3) вызначэнне фактараў зменаў, на якія трэба ўздзейнічаць. Функцыянаванне такога механізму абумоўлена прывядзеннем аб'екта ў належны стан у адпаведнасці з мэтамі яго рэфармавання [2].

У. Пястоў сфармуляваў паняцце арганізацыйна-эканамічнага механізму падвышэння эфектыўнасці функцыянавання прадпрыемства. Ім, на думку даследчыка, выступае «цэльная сістэма ўзаемасувязаных і дакладна ўпарадкаваных арганізацыйных і эканамічных мерапрыемстваў, якія паспяхова рэалізуюцца з дапамогай адпаведных формаў і метадаў гаспадарання і дазваляюць прадпрыемству забяспечыць рост эфектыўнасці ва ўсіх сферах яго дзейнасці і на ўсіх узроўнях кіравання». Змест дадзенай катэгорыі праяўляецца праз знаходжанне дакладнай узаемасувязі паміж элементамі і выбар неабходных інструментаў, пошук найбольш дзейсных спосабаў іх ажыццяўлення з мэтай дасягнення пэўных якасных паказчыкаў функцыянавання суб'екта гаспадарання. На прадстаўленым графічным увасабленні дадзены механізм займае сярэдні стан (выдаткі /рэсурсы/ → механізм → вынікі дзейнасці), складаецца з дзвюх падсістэм (арганізацыйнай і эканамічнай і відаў іх забеспячэння) [10].

У. Бабенка дае падобнае да прадстаўленага ў слоўніку [11] тлумачэнне арганізацыйна-эканамічнага механізму як супольнасці ўзаемасувязаных прыёмаў, рычагоў, метадаў, інструментаў і працэдур, якія ўплываюць на арганізацыйна-эканамічныя працэсы аб'екта кіравання (г.зн. прадпрыемства). Паказчыкам каштоўнасці эфектыўнага механізму (у дадзеным выпадку – дыверсіфікацыі вытворчасці)

выступае яго універсальная здольнасць адаптаваць змены ўнутранага асяродку прадпрыемства да існых рынкавых умоў [1].

Беларускі даследчык І. Калеснікава прадстаўляе структуру г. зв. эканамічнага механізму гаспадарання прадпрыемства. На думку аўтара, ён з'яўляецца часткай больш агульнага, гаспадарчага механізму і пададзены як сістэма пэўных элементаў (іх, у гэтым выпадку, тры – арганізацыйная структура прадпрыемства, г. зн. формы гаспадарання; арганізацыйная культура, г. зн. унутрыгаспадарчыя адносіны; пэўныя метады гаспадарання). Калі зірнуць на аўтарскае графічнае адлюстраванне такога механізму, бачныя, ужо адзначаныя ў С. Дронава вонкавыя і ўнутраныя фактары ўплыву на яго фармаванне. Таксама прасочваецца ўзгаданае раней прамежкавае становішча гэтага механізму паміж уваходнымі рэсурсамі і вынікамі дзейнасці прадпрыемства [6].

Д. Савіч прадстаўляе эканамічны механізм антыкрызіснага кіравання аграрным прадпрыемствам. Ён фармулюецца як раней адзначаная сістэма інструментаў і фармуецца праз вызначэнне канкрэтных прынцыпаў і ўласцівасцяў яго структуры. Увасоблены такі механізм праз розныя ўзроўні ўнутранай структуры прадпрыемства. Адным з рэсурсаў дадзенага механізму аўтар вызначае рынкавую інфармацыю [12].

Падобны механізм разглядае А. Вінаградаў. Ён падае практычна такую ж яго сутнасць, адзначае ролю адпаведнага інфармацыйнага забеспячэння. Можна дапоўніць пададзеныя ім уласцівасці такога механізму: шматмернасць, сістэмнасць, адаптыўнасць, самаразвіццё, саманаладка [4].

А. Каламоец разглядае эканамічны механізм у адносінах да эфектыўнасці рэгіянальнага развіцця. Ён фармулюе яго як сістэму інструментаў, скіраваных на вывучэнне тэндэнцый такога развіцця і іх пераўтварэнне. Прадстаўлена трохузроўневая структура рэалізацыі дадзенага механізму, складзеная з аналітычнага (разгляд існага стану) → канцэптуальнага (вызначэнне мэтаў) → кіраўніцкага (апісанне інструментаў дасягнення дадзеных мэтаў) яго элементаў [7].

У. Сафаран разглядае блізкі да прадмета нашага зацікаўлення арганізацыйна-эканамічны механізм рэструктурызацыі прадпрыемстваў, але ў сферы адпачынку. Ён звязвае фармаванне такога механізму з дзейнасцю па ажыццяўленню пэўнага комплексу захадаў, накіраваных на дасягненне канкрэтных вынікаў. Унікальным тут выступае факт разгляду звязаных з такімі мерапрыемствамі дакументаў. Пры апісанні шляху пабудовы і рэалізацыі такога механізму даследчык вылучае шэсць фазаў, – ад пастаноўкі задач да ацэнкі эфектыўнасці яго рэалізацыі [13].

Даследчыкі з развітых краінаў пры разглядзе асаблівасцяў расійскіх эканамічных рэформаў адзначаюць такія элементы механізму структурнай перабудовы на прадпрыемствах, як бартэр, змены ў таварнай палітыцы, структуры кіравання, узаемаадносінах з банкамі, міністэрствамі і г. д. [16].

Нарэшце, Я. Каралёў падае тлумачэнне арганізацыйна-эканамічнага механізму разгледжаных ім прамысловых комплексаў, удакладняючы вышэйпрыведзенае азначэнне механізму, дзе фігуруюць унутраныя і вонкавыя сувязі эканамічнай сістэмы як аб'ект уплыву, а якасныя характарыстыкі гаспадарчай дзейнасці – як паказчыкі мэтаў змснаў [8].

**Заключэнне**. Падсумоўваючы вышэй разгледжаныя палажэнні, можна зрабіць наступныя высновы адносна сутнасці і месца эканамічнага механізму рэструктурызацыі прадпрыемстваў прамысловасці.

1. Эканамічны механізм рэструктурызацыі з'яўляецца часткай больш высокай структуры на макраўзроўні (гаспадарчага механізму).
2. Элементамі такога механізму выступаюць пэўныя рычагі, інструменты і мерапрыемствы, рэалізацыя якіх у супольнасці дазваляе дасягнуць на прадпрыемстве канкрэтных, раней абраных мэтаў (павышэння эфектыўнасці яго дзейнасці і г. д. – гл., напрыклад,[17–19]).
3. Структура арганізацыі гэтага механізму арганічна звязана з наяўнымі ў суб'екта гаспадарання рэсурсамі і эфектыўнасцю іх выкарыстання.
4. Уплыў на фармаванне пэўнага механізму робіць значная колькасць сацыяльна-эканамічных фактараў рознага ўзроўню функцыянавання.
5. Асаблівасці структуры механізму рэструктурызацыі кожнага прадпрыемства унікальныя. Аднак можна меркаваць пра наяўнасць галіновай спецыфікі эканамічнага механізму рэструктурызацыі прадпрыемстваў.

З улікам зробленага аналізу навуковай літаратуры неабходна ажыццяўляць актуальную для краіны распрацоўку эканамічнага механізму рэструктурызацыі экспартаарыентаваных прадпрыемстваў машынабудавання Беларусі.

## Літаратура

1. Бабенко, В. Н. Организационно-экономический механизм эффективной диверсификации производства: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05 / В. Н. Бабенко; Кубанский госуд. технол. ун-т. – Краснодар, 2006. – 24 с.

2. Букреев, А. М. Организационно-экономический механизм антикризисного управления предприятием: автореф. дис. … д-ра экон. наук: 08.00.05 / А. М. Букреев; Воронежский госуд. техн. ун-т. – Воронеж, 2000. – 36 с.

3. Вечканов, Г. С. Современная экономическая энциклопедия / Г. С. Вечканов, Г. Р. Вечканова. – СПб.: Лань, 2002. – 880 с.

4. Виноградов, А. А. Экономический механизм антикризисного управления на предприятии: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05

/ А. А. Виноградов; Пермский гос. ун-т. – Пермь, 2002. – 19 с.

5. Дронов, С. В. Организационно-экономический механизм инновационной деятельности предприятия: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05 / С. В. Дронов; Белгородская гос. техн. академия строит. материалов. – Белгород, 2001. – 23 с.

6. Колесникова, И. И. Экономический механизм хозяйствования предприятия в условиях рыночных отношений (на примере станкостроительных предприятий г. Гомеля): автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05 / И. И. Колесникова; Белорус. гос. экон. ун-т. – Минск, 1995. – 20 с.

7. Коломоец, О. В. Экономический механизм повышения конкурентоспособности экономики региона (на примере Павлодарской области): автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.04 / О. В. Коломоец; Ин-т экономики. – Алматы, 1995. – 21 с.

8. Королёв, Е. А. Организационно-экономический механизм трансформации промышленных комплексов: автореф. дис. … д-ра экон. наук: 08.00.05 / Е. А. Королёв; Уральский гос. экон. ун-т. – Екатеринбург, 2003. – 44 с.

9. Мочерний, С. Господарський механізм / С. Мочерний // Економічна енциклопедія: у 3 т. Т. 1. – Київ: Академия, 2000. – С. 269–270.

10. Пестов, В. Ю. Организационно-экономи-ческий механизм повышения эффективности функционирования промышленного предприятия: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05 / В. Ю. Пестов; Воронежский гос. техн. ун-т. – Воронеж, 2004. – 20 с.

11. Райзберг, Б. А. Современный экономический словарь / Б. А. Райзберг, Л. Ш. Лозовский. – 4-е изд., перераб. и доп. – М.: Инфра-М, 2005. – 480 с.

12. Савич, Д. П. Экономический механизм антикризисного управления сельскохозяйственным предприятием: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05 / Д. П. Савич; Челябинский гос. агроинжен. ун-т. – Челябинск, 2002. – 25 с.

13. Сафарян, В. Р. Организационно-экономический механизм реструктуризации предприятий гостиничного бизнеса: автореф. дис. … канд. экон. наук: 08.00.05 / В. Р. Сафарян; Московский гос. ун-т сервиса. – М., 2000. – 23 с.

14. Экономическая энциклопедия / гл. ред. Л. И. Абалкин. – М.: Экономика, 1999. – 1055 с.

15. Domingo, C., Tonella, G. Towards a theory of structural change // Structural change and economic dynamics. – 2000. – Vol. 11, № 1–2. – P. 209–225.

16. Linz, S., Krueger, G. Enterprise restructuring in Russia's transitional economy: formal and informal mechanisms // Comparative economic studies. – 1998. – Vol. 40, № 2. – P. 5–52.

17. Markides, C., Singh, H. Corporate restructu-ring: A symptom of poor governance or a solution to past managerial mistakes? // European management journal. – 1997. – Vol. 15, № 3. – P. 213–219.

18. Nalepka, A. Restrukturyzacja przedsiębiorstwa. Zarys problematyki. – Warszawa-Kraków: Wydawnictwo naukowe PWN, 1999. – 251 s.

19. Suszyński, C. Restrukturyzacja, konsolidacja, globalizacja przedsiębiorstw. Doświadczenia i perspectywy polskiej transformacji. – Warszawa: Polskie wydawnictwo ekonomiczne, 2003. – 405 s.